В. Шошиным с процессами исторического развития нашего общества, вскрывается обусловленность идейно-художественного постижения действительности политической обстановкой, теми переменами, которые были характерны для разных этапов нашего экономического и духовного развития. Проблема интернационализма литературы, показанная в плане инонациональной тематики, получила в книге всестороннее освещение. Ее отражает жанровое многообразие произведений, рассказ о личных контактах писателя с жизнью народа другой национальности, рассмотрение поэтапного развития советской литературы в связи с историческим движением общества к коммунизму, сопоставление расцвета национальных культур народов СССР с упадком их на Западе, вскрытие коренных отличий инонациональной темы в произведениях буржуазных и советских писателей.

**Т. Г. Симонова**

**Праблематыка газетных выступленняў /** Пад рэд. Б. В. Стральцова.— Мінск: Выд-ва БДУ, частка I, 1980.— 176 с; частка II, 1982.— 176 с.

Аўтарытэт і ўздзеянне сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды ўзрастаюць у нашай краіне з кожным годам. Любоў і павагу, давер'е народа яны заваявалі, дзякуючы глыбіні, праўдзівасці і прынцыповасці выступленняў па самых розных пытаннях унутранага і міжнароднага жыцця, дзякуючы вялікаму уменню быць сапраўдным калектыўным прапагандыстам, агітатарам і арганізатарам шырокіх мас. Зноў і зноў пераконваешся ў гэтым, калі знаёмішся з кнігай «Праблематыка газетных выступленняў». У яе стварэнні прынялі ўдзел прафесары Б. В. Стральцоў, Е. Л. Бондарава, В. А. Пыжкоў, дацэнты Т. Д. Арлова, В. І. Дубовік, выкладчыкі І. І. Беленькі, В. М. Куцэнка, А. В. Балаш і іншыя работнікі кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Аўтары аналізуюць дзейнасць рэдакцыйных калектываў рэспублікі і іх аддзелаў у святле рашэнняў XXV і XXVI з'ездаў Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Першая частка выдання прысвечана аналізу прыёмаў і метадаў, якія выкарыстоўваюцца рэдакцыйнымі калектывамі, а таксама асобнымі публіцыстамі рэспублікі пры асвятленні пытанняў партыйнага і міжнароднага жыцця, практыкі прапаганды марксісцка-ленінскай тэорыі і камуністычнага будаўніцтва, ідэйна-маральнага выхавання, развіцця навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва, адукацыі.

Аўтары даследавання правільна адзначаюць, што партыйная праблематыка цікавіць большасць чытачоў газеты. Выклікана гэта, падкрэсліваецца ў кнізе, «некалькімі сацыяльнымі перадумовамі. Па-першае, савецкія людзі разглядаюць партыйную справу як сваю кроўную, самую блізкую. Планы партыі набываюць сілу народных, іх ажыўлена абмяркоўваюць і настойліва здзяйсняюць мільёны. Па-другое, камуністы сталі героямі нашага часу, а іх жыццё — штодзённым узорам. З іх бяруць прыклад у працы, у вучобе, у штодзённых паводзінах. Па-трэцяе, традыцыямі нашай прэсы, для якой сістэматычная публікацыя матэрыялаў на партыйныя тэмы з'яўляецца своеасаблівай справаздачай партыйных камітэтаў перад народам». Грунтоўны раздзел першай часткі «Праблематыкі газетных выступленняў» прысвечаны асвятленню на старонках перыядычных выданняў пытанняў навукі і тэхнікі.

Работа эканамічных аддзелаў рэдакцый, а таксама аддзелаў, якія асвятляюць праблемы савецкага і культурнага будаўніцтва, сацыялістычнага быту аналізуецца ў другой частцы даследавання. На шматлікіх прыкладах аўтары кнігі паказваюць, як рэдакцыйныя калектывы Беларусі вядуць абмеркаванне надзённых пытанняў і праблем, словам і справай мабілізуюць працоўныя масы на дасягненне новых вышынь у развіцці эканомікі і культуры рэспублікі. Многія газеты, адзначаюць даследчыкі, умела арганізоўваюць сацыялістычнае спаборніцтва, прапагандуюць перадавыя метады працы, змагаюцца за ўкараненне дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць, за рэжым эканоміі і беражлівасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Праблематыка газетных выступленняў, падкрэсліваецца ў даследаванні, катэгорыя адначасова і даволі стабільная, разлічаная на працяглы час дзеяння, і надзвычай рухомая, прыстасаваная да аператыўных патрэб грамадства. Стабільнасць праблематыкі абумоўлена асноватворнымі фактарамі нашага сацыялістычнага і эканамічнага развіцця, глыбіннай сутнасцю жыццядзейнасці савецкіх людзей, якія нацэлены на будаўніцтва камунізму. Рухомасць жа праблематыкі тлумачыцца неабходнасцю пісаць на «злобу дня», фарміраваць і нацэльваць грамадскую думку на выкананне канкрэтных задач, пастаўленых перад народнай гаспадаркай ці яе асобнымі галінамі на пэўны перыяд. Даследаванне «Праблематыка газетных выступленняў», несумненна, прынясе вялікую карысць журналістам у іх далейшай рабоце па ажыццяўленню велічных прадвызначэнняў XXVI з'езда КПСС. З цікавасцю пазнаёмяцца і нямала карыснага знойдуць у кнізе і прапагандысты, агітатары, партыйныя работнікі і актывісты, словам, усе тыя, хто заняты праблемамі выхавання савецкага чалавека.

**А. Ф. Мяснікоў**
**П. М. Бараноўскі,**